**24.** Прачытайце ўважліва прыклады: *1) буланы; 2) лясны; 3) зеленаваты*. Які(-ія) прыметнік(-і) з прапанаваных не ўтварае(-юць) ступеняў параўнання?

**А)** усе прыметнікі. **Б)** няма патрэбных прыметнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

---

**25.** Дадзены словазлучэнні на рускай мове:

*1) твое доверие; 2) желтый оттенок; 3) красивое блюдце; 4) густая тень.*

Падбярыце з прапанаваных правільныя адпаведнікі ў беларускай мове:

*а) твой давер; б) тваё давер'е; в) твая давер; г) жоўты адценне;*
*д) жоўтае адценне; е) жоўтая адценне; ё) прыгожае блюдца;*
*ж) прыгожы сподак; з) прыгожая блюдца; і) густая цень;*
*к) густы цень; л) густое цень.*

**А)** 1-а, 2-д, 3-ж, 4-к. **Б)** 1-б, 2-г, 3-ё, 4-і. **В)** 1-в, 2-е, 3-з, 4-д.
**Г)** 1-а, 2-д, 3-ё, 4-к. **Д)** 1-б, 2-е, 3-ж, 4-і.

---

**26.** Вядомыя імёны беларускіх мастакоў слова, якія зрабілі вялікі ўклад у развіццё літаратуры:

*1) Алесь Дудар; 2) Юрка Лявонны; 3) Язэп Пушча; 4) Міхась Чарот.*

Якія сапраўдныя імёны паэтаў?

*а) Кудзелька Міхаіл Сымонавіч; б) Дайлідовіч Аляксандр Аляксандравіч;*
*в) Юркевіч Леанід Мікалаевіч; г) Плашчынскі Іосіф Паўлавіч.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-в, 3-г, 4-а. **В)** 1-в, 2-г, 3-а, 4-б.
**Г)** 1-г, 2-а, 3-б, 4-в. **Д)** 1-а, 2-в, 3-б, 4-г.

---

**27.** Першая беларуская жанчына-драматург, пісьменніца жыла ў XVIII стагоддзі і была для свайго часу вельмі адукаваная, ведала некалькі замежных моў, пісала філасофскія трактаты, вершы, драматычныя творы. Яе звалі … .

**А)** Уршуля Радзівіл. **Б)** Каміла Марцынкевіч. **В)** Эмілія Плятэр.
**Г)** Саламея Русецкая. **Д)** Гелена Скірмунт.

---

**28.** У 2009 годзе падчас правядзення Дня беларускага пісьменства ў гэтым раённым цэнтры быў адкрыты помнік Ф. Багушэвічу. Як называецца месца?

**А)** Глуск. **Б)** Горкі. **В)** Смаргонь. **Г)** Дрыбін. **Д)** Слонім.

---

**29.** Гэты горад лічыцца "вішнёвай" сталіцай Беларусі. Тут ёсць скульптура "Вішанька" і вялікі вішнёвы сад, у якім падчас закладкі было пасаджана 1414 дрэў. Як называецца горад?

**А)** Бабруйск. **Б)** Слуцк. **В)** Брэст. **Г)** Рубяжэвічы. **Д)** Глыбокае.

---

**30.** Невялікі пейзажны верш, у якім асноўнае месца займаюць яскравыя зрокавыя, пластычныя вобразы, называецца … .

**А)** рэхаверш. **Б)** акраверш. **В)** айран. **Г)** акварэль. **Д)** актава.

---


КОНКУРС

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 3. Тыраж 23250 экз. 2022 г.


# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2022»

*Чацвер, 17 лютага 2022 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Колькі прыметнікаў ужыта ў вершаваных радках У. Дубоўкі?

> *Цудоўны скарб у творчасці народнай*
> *Для нас сабраны мудрымі дзядамі.*
> *Яго адкінуць – значыць без пашаны*
> *Паставіцца да продкаў працавітых.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**2.** Кожны празаічны твор мае пэўную будову. Вызначце правільны варыянт паслядоўнасці развіцця сюжэта ў творы.

*1) развіццё дзеяння; 2) развязка; 3) кульмінацыя; 4) завязка.*

**А)** 1, 2, 3, 4. **Б)** 2, 1, 4, 3. **В)** 3, 4, 2, 1. **Г)** 4, 3, 2, 1. **Д)** 4, 1, 3, 2.

---

**3.** Дадзены назвы беларускіх рэк: *1) Прыпяць; 2) Арэса; 3) Славечна*. У якой назве "схаваўся" лічэбнік (склады і літары не пераставуляць)?

**А)** ва ўсіх назвах. **Б)** няма такой назвы. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**4.** Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае ў сказе слова?

*Бусел – прыгожая* ***птушка****.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем.
**Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

**5.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі А. Вольскага. Якому слову з тэксту адпавядае лексічнае значэнне ‘нізкая гліняная пасудзіна з выпуклымі бакамі і вузкім горлам’?

*Ганчар – сапраўдны чараўнік.*
*Ён гліны ўзяў камяк,*
*І вось збанок на крузе ўзнік,*
*А потым – круглы гляк.*

**А)** ганчар. **Б)** гліна. **В)** камяк. **Г)** збанок. **Д)** гляк.

---

**6.** Выберыце з дадзеных прыкладаў толькі ўстойлівыя спалучэнні.

*1) павесіць паліто; 2) вочы разбягаюцца; 3) брацца за нос; 4) малоць языком.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**7.** Юрась атрымаў заданне вызначыць сказ са звароткам.

*1. Я вітаю цябе, незабыўны мой кут!*
*2. Лес – жывая вопратка зямлі.*
*3. Усякая думка, выражаная словам, ёсць бязмежная сіла.*

Як вы думаеце, які сказ выбраў хлопчык?

**А)** усе сказы. **Б)** не выбраў патрэбнага сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**8.** Пастаўце ў алфавітным парадку назвы гарадоў, дзе ў свой час воляй лёсу жыў Максім Багдановіч.

*1) Мінск; 2) Гродна; 3) Ялта; 4) Яраслаўль; 5) Ніжні Ноўгарад.*

**А)** 1, 2, 3, 4, 5. **Б)** 2, 1, 5, 3, 4. **В)** 3, 5, 1, 4, 2. **Г)** 4, 3, 5, 2, 1. **Д)** 5, 4, 2, 1, 3.

---

*Прыеду я абавязкова*
*У той любімы мой куток,*
*Дзе першае прамовіў слова,*
*Дзе я зрабіў свой першы крок.*
*Прыеду, каб адчуць душою,*
*Як веюць водарам лугі,*
*Аб чым шапоча над ракою*
*Лес – сябар мой найдарагі.*

**9.** Колькі ўсяго асабовых займеннікаў ужыта ў вершаваных радках М. Пазнякова?

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**10.** Выберыце з прапанаваных няправільна напісаныя словы.

*1) медуза; 2) паспарт; 3) насоўка; 4) гратка.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**11.** З дадзеных прыкладаў выберыце правільна ўтвораныя словазлучэнні *назоўнік+лічэбнік*.

*1) каля трое сутак; 2) дзве пары красовак; 3) пяць нажніц.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**12.** У якіх словах неабходна напісаць на месцы пропуску літару ***ы***?

*1) р..тушор; 2) р..зінавы; 3) р..кашэт; 4) р..фрэн; 5) р..цэнзія.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** у 1, 2. **В)** у 2, 3. **Г)** у 3, 4. **Д)** у 4, 5.

---

**13.** Прачытайце ўважліва сказ.

*Калі снег паступова пачаў сыходзіць з палёў, раскрываючы спачатку пагоркі_ ды ўтвараючы на іх невялікія адкрытыя лысіны, а пасля больш шырокія плямы-праталіны, ласка часцей пачала з’яўляцца ў полі, выходзіла на свае начныя паляванні.*

Які знак прыпынку патрэбна паставіць на месцы пропуску?

**А)** знак прыпынку не патрэбны. **Б)** коску. **В)** працяжнік.
**Г)** кропку з коскай. **Д)** двукроп’е.

---

**14.** Якія словы з прапанаваных напішаце з раздзяляльным мяккім знакам (**ь**)?

*1) д..яблам; 2) кап..ём; 3) сол..ю; 4) верф..ю.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**15.** Выберыце з дадзеных толькі назоўнікі мужчынскага роду.

*1) немач; 2) дроб; 3) фальш; 4) золь.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**16.** Якія словы з прапанаваных напішаце з часціцай ***не*** разам?

*1) (не)пагадзь; 2) (не)вялікі; 3) (не)дзе; 4) (не)дачуць.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**17.** Прачытайце ўважліва прыклады:

*1) у кірунку да музея; 2) пасля таго як прачытаў; 3) адбіцца ад рук.*

Выберыце толькі словазлучэнні.

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**18.** Як у народзе называецца цёмная летняя ноч з громам, маланкай, праліўным дажджом або толькі з бесперапыннымі зарніцамі?

**А)** палярная. **Б)** рабінавая. **В)** купальская.
**Г)** калядная. **Д)** грамніцы.

---

**19.** Выберыце з прапанаваных слоў толькі лічэбнікі.

*1) адна восьмая; 2) дваццатка; 3) шосты; 4) трыа; 5) удвая.*

**А)** усе словы – лічэбнікі. **Б)** няма лічэбнікаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

---

**20.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі Паўлюка Труса. Якое слова прапушчана?

*Падаюць сняжынкі –*
*…-росы,*
*Падаюць бялюткі*
*за маім акном.*

**А)** дыядэмы. **Б)** дыярамы. **В)** дыяменты.
**Г)** дыяграмы. **Д)** дыяметры.

---

**21.** Суаднясіце назвы твораў і іх аўтараў:

| | |
|---|---|
| *1) “Продкі”;* | *а) Уладзімір Ліпскі;* |
| *2) “Радзіма мая дарагая…”;* | *б) Алесь Пісьмянкоў;* |
| *3) “Ад роду – да народу”;* | *в) Любоў Тарасюк;* |
| *4) “Жураўлі на Палессе ляцяць”;* | *г) Алесь Бачыла;* |
| *5) “Імя Айчыны”.* | *д) Алесь Ставер.* |

**А)** 1а, 2б, 3в, 4г, 5д. **Б)** 1б, 2г, 3а, 4д, 5в. **В)** 1в, 2а, 3д, 4б, 5г.
**Г)** 1г, 2д, 3б, 4в, 5а. **Д)** 1д, 2в, 3г, 4а, 5б.

---

**22.** Падбярыце беларускія адпаведнікі да выразаў:

*1) частное лицо; 2) действующее лицо; 3) официальное лицо.*
*а) дзейная асоба; б) афіцыйная асоба; в) прыватная асоба.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-а, 3-в. **Г)** 1-б, 2-в, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**23.** Ад якога дзеяслова з дадзеных нельга ўтварыць дзеепрыслоўе?

*1) таўчы; 2) прымацаь; 3) гарчыць.*

**А)** ад усіх дзеясловаў. **Б)** няма такога дзеяслова. **В)** ад 1. **Г)** ад 2. **Д)** ад 3.